Аўторак, 14 Студзень 2020

Блогеру Дуброўскіх прысудзілі 810 рублёў штрафу за ўдзел у менскіх акцыях

Друкаваць (/news/administracyiny-perasled/item/3473-blogeru-prysudzili-shtraf?tmpl=component&print=1) | Эл. пошта (/component/mailto/?tmpl=component&template=lt_news&link=6b86c7ade9c9a7fc32dd05891149705ebc3d993c)

Ацаніць гэты матэрыял (2 галасоў)



(/media/k2/items/cache/16268da44f149e859e5069f5fcdbf9fb_XL.jpg)

Аляксандар Дуброўскіх

Суд Кастрычніцкага раёну Віцебску аштрафаваў віцябляніна Аляксандра Дуброўскіх на 30 базавых велічынь за ўдзел у акцыі супраць інтэграцыі з Расеяй, якая праходзіла ў Менску 20 сьнежня 2019 году. У якасьці адзінага доказу вінаватасьці віцябляніна міліцыянты прад'явілі ролік са стрыму «Радыё Свабода».

Справу 14 студзеня разгледзеў судзьдзя **Ільля Белавус**. У якасьці прадстаўніка Кастрычніцкага РАУС Віцебску ў працэсе браў удзел маёр міліцыі **Сяргей Вяракса**.

Віцяблянін **Аляксандар Дуброўскіх**, які называе сябе блогерам («Страна для жизни Витебск (https://www.youtube.com/channel/UC5dNk_l5uGLeTWS376kVOEw)»), прызнаны вінаватым у парушэньні парадку арганізацыі альбо правядзеньня масавага мерапрыемства (ч.1 арт. 23.34 КаАП). Паводле пратаколу, Дуброўскіх 20 сьнежня 2019 году браў актыўны ўдзел у несанкцыянаваным мітынгу на Кастрычніцкай плошчы ў Менску, выкрыкваў лёзунгі «Жыве Беларусь!» і «Незалежнасьць!».

> Між тым, адзіным на судзе доказам правапарушэньня Дуброўскіх быў відэаролік (https://www.youtube.com/watch?v=GZd-MJVU5AY&feature=emb_logo) зь ягоным інтэрвію падчас жывой трансьляцыі «Радыё Свабоды». Ніякіх лёзунгаў падчас інтэрвію віцяблянін не выкрыкваў.

Сам Дуброўскіх вінаватым сябе не прызнаў. Заявіў на судзе, што прысутнічаў на Кастрычніцкай плошчы выключна ў якасьці блогера – каб здымаць падзеі на тэлефон. Запэўніваў, што знаходзіўся на такім мерапрыемстве ўпершыню.

> Пасьля таго як заявіў, што ненавідзіць Лукашэнку і што *«Лукашэнку трэба прыбраць»*, Дуброўскіх **быў выдалены з судовай залі**.

Судзьдзя Ільля Белавус прызнаў мужчыну вінаватым у правапарушэньні, прадугледжаным ч.1 арт.23.34 КаАП, і пакараў штрафам у памеры **30 базавых велічынь (810 рублёў)**.

Аляксандар Дуброўскіх зьбіраецца абскардзіць рашэньне суду Кастрычніцкага раёну ў Віцебскім абласным судзе.

Зьміцер Міраш

Камэнтуйце гэтую навіну

(https://www.facebook.com/vitebskspring/posts/2482061598726951?__tn__=-R) на нашай старонцы ў facebook!

Чытайце таксама **навіны “Віцебскай Вясны” ў Telegram (https://t.me/vicspring)**.

Апублікавана ў Адміністрацыйны перасьлед (/news/administracyiny-perasled) , Мірныя сходы (/news/mirnyja-skhody)
Тэгі: артыкул 23 34 КаАП (/itemlist/tag/артыкул%2023%2034%20КаАП) Кастрычніцкі раён (/itemlist/tag/Кастрычніцкі%20раён) Ільля Белавус (/itemlist/tag/Ільля%20Белавус) Аляксандар Дуброўскіх (/itemlist/tag/Аляксандар%20Дуброўскіх)

Яшчэ ў гэтым разьдзеле: « Яшчэ адзін суд за публікацыю ў Facebook адбудзецца ў Віцебску (/news/administracyiny-perasled/item/3472-sud-za-facebook) «Хутка не чакайце!..» Блогеру «Шэраму Кату» дадалі яшчэ 15 сутак » (/news/administracyiny-perasled/item/3474-dali-yashche-15-sutak)

Вярнуцца ў пачатак (/news/administracyiny-perasled/item/3473-blogeru-prysudzili-shtraf#startOfPageId3473)

© 2011 - 2023 Віцебская вясна (/). Пры выкарыстаньні матэрыялаў абавязковая гіпэрспасылка. Email: vitebskspring@proton.me (mailto:vitebskspring@proton.me)

(Https(/Ht